**Т.І. Борбат *(Мінск)***

# ПАЭТЫЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў ЛІРЫЦЫ С.ГРАХОЎСКАГА 60 -70-х ГАДОЎ

Канец 60-х – 70-я гады мінулага стагоддзя былі адзначаны ўзрастаннем літаратурна-грамадскай цікавасці да тэмы працы. У літаратуру прыйшоў "асабліва актыўны, напорысты герой, які гарэў жаданнем працаваць, будаваць, ствараць"[1, с.27].

Чалавек працы становіцца цэнтральным героем паэзіі С.Грахоўскага. Няспынная пагоня за Часам, жаданне затрымаць яго, увасобіць у ёмістым слове, прымушае паэта шмат ездзіць. І не проста падарожнічаць, а працаваць побач з тымі, пра каго ён піша. З рубанкам і цеслярскім малатком запомнілі яго новапалачане, што ў 60-я гады будавалі свой горад. У выніку гэтай паездкі з'явіліся апавяданні "Які вялікі дзень", "Засвеціцца акно", на-рыс "Горад маладосці" (1960) і цыкл вершаў "Нафтаград" (сюды ўключаны і "Полацкі сшытак" са зборніка вершаў "Чаканне"). Гэта своеасаблівы па-этычны рэпартаж пра будаўнікоў Полацкага нафтаперапрацоўчага завода. У полі зроку аўтара – канкрэтныя людзі-будаўнікі: кранаўшчыца Валя Забаронька ("Кранаўшчыца"), брыгадзір такелажнікаў Іван Чарненка ("Бацькі і дзеці"), парторг будоўлі Мікалай Чэчат ("Парторг").

Аднак многія вершы гэтага цыклу сёння чытаюцца без асаблівага захаплення. Паэт, ўслаўляючы сваіх герояў, нярэдка ідэалізаваў рэчаіснасць, абыходзіў нявырашаныя праблемы жыцця, яго канфлікты. І на працоўны энтузіязм мы глядзім зараз па-іншаму, ведаючы, чым ён быў выкліканы. Само па сабе жаданне паэта "персаніфікаваць" лірыку, даць слова розным людзям, раскрыць іх унутраны свет, было станоўчым. Але ігнараванне рэальных жыццёвых абставін прыводзіла да ілюстрацыйнасці.

З асаблівай павагай і любоўю гаворыць паэт аб чалавеку працы ў зборніках "Табе зайздросціць сонца"(1963), "Памяць"(1965), "Тры вымярэнні"(1967), "Паэма дарог"(1970). Лепшымі, на нашу думку, з'яўляюцца вершы "Прыгожыя рукі", "Яе далоні пахнуць мятай", "Успамін", "Ад сцюжы пасівелі вейкі", у якіх паэт апявае душэўнае хараство і ўнутраную прыгажосць рабочай-палачанкі: "Навошта ты хаваеш рукі //У драпінах і мазалях? //Заўжды шурпатыя ад тынку, //Парэпаныя ад вады, //Яны не маюць адпачынку // У спёку, ў дождж і ў халады" ("Прыгожыя рукі" [2, с.283]).

Калі ў вершах з цыклу "Нафтаград", абапіраючыся на канкрэнтныя факты, мастак дае "замалёўкі з натуры", захапляецца бытам працаўнікоў, іх справамі, то ў пазнейшых сваіх творах ("Сейбіт", "Зямля", "Вышэйшы чын") паэт "настройваецца на больш элегічны лад, на роздум пра высокую годнасць чалавека-працаўніка і бессмяротнасць яго спраў"[4, с.116]. Паглыбляецца само паняцце "працы", яна разглядаецца мастаком у больш



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шырокім разуменні – як аснова чалавечага жыцця ўвогуле, мера чалавечай годнасці і вартасці. Як заўважае М.Мішчанчук, творы паэта напаўняюцца "падводным сэнсам" [4, с.117].

Прыгадаем, напрыклад, верш "Сейбіт"(1966). Даволі вобразны пачатак твора: хаваюць сціплага чалавека – сейбіта, аратага, касца. Хоць хаваюць яго без аркестраў, без вянкоў, ганаровай вахты і гучных некралогаў, усё навокал схілілася ў пашане, захавала памяць аб нястомным працаўніку: "Стаяць бярозы ў ганаровай варце, // Лятаюць ластаўкі над вузкаю трунoю, // Над пыльнаю дарогаю у жыце, // І журацца пры студнях жураўлі" [3, с.76].

Сэнс верша выяўляецца не праз знешнія, эфектныя дэталі, а вынікае з агульнага пафасу, аўтарскай устаноўкі, рытмічна-інтанацыйнай арганізацыі твора. У ім няшмат экспрэсіўна афарбаваных эпітэтаў, параўнанняў (звялыя рамонкі, вузкая труна, плыве, як човен, труна), а пераважаюць эмацыянальна-насычаныя метафары ("стаяць бярозы ў ганаровай варце", "журацца пры студнях жураўлі", "плачуць ластаўкі"). Напружанасць сітуацыі, узрушанасць надаюць кожнаму радку дадатковы сэнс, ствараюць зрокавае ўспрыняцце з'явы. Так з дакладнага назірання вынікае праўдзівая карціна – плыве сярод жытоў, як човен, вузкая труна.

Толькі праца, уменне ўсё аддаваць людзям, нічога не патрабуючы ўзамен, вызначаюць бессмяротнасць жыцця чалавека, – сцвярджае паэт.

Гэта ж думка праводзіцца і ў вершы "Вышэйшы чын". Праца, у разуменні паэта, катэгорыя маральная. Чалавек вышэйшага чыну – звычайны калгаснік, які на досвітку выходзіць дзень у дзень у поле. Увесь плён сваёй працы ён бескарысліва аддае людзям: "Выходзіў дзень у дзень у поле, // Хоць і ўчарнеў, і перапаў, //А досвітку яшчэ ніколі //У цёплай хаце не праспаў..."[3, с.75].

Аддаваць – і таму быць багатым. У вершы паэт закранае катэгорыю "быцця", а не "быту", быту мяшчанскага, дзе багацце асацыіруецца з матэрыяльным дабрабытам, калі кожны імкнецца болей прыдбаць для сябе. Індывідуалізм – зло, – сцвярджае паэт. Зло, якое пазбаўляе чалавека здоль -насці тварыць дабро, абясцэньвае само паняцце дабра. Своеасаблівым эталонам бескарыслівага служэння людзям з'яўляецца для паэта чалавек ад зямлі, сейбіт, хлебароб, "якому не трэба іншых чыноў".

Такім чынам, пры адлюстраванні працы як найвышэйшай каштоўнасці жыцця чалавека С.Грахоўскі, думаецца, працягвае традыцыі Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа. Паэт апявае прыгажосць і веліч працы, нягледзячы на яе, як, здаецца на першы погляд, будзённасць і празаічнасць.

### *Літаратура*

1. ***Гніламёдаў У.В.*** Пафас жыццесцвярджэння: Вобраз чалавека актыўнай жыццёвай пазіцыі ў сучаснай беларускай паэзіі. – Мн., 1985.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. ***Грахоўскі С.І.*** Выбраныя творы.У 2 т. Паэзія. – Мн., 1973.– Т.1.
3. ***Грахоўскі С.І.*** Выбраныя творы. У 2 т. Вячэрні звон: Вершы, паэмы. – Мн., 1994. – Т.1.
4. ***Мішчанчук М.І.*** Беларуская літаратура на сучасным этапе: Літ-крытыч. артыкулы. – Мн., 1983.

й архив библиотеки МГУ имени А.